## Вучэбная дысцыпліна «Беларуская палеаграфія»

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята<br>(агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05 0232 -01 Беларуская філалогія<br>Цыкл спецыяльных дысцыплін: дзяржаўны кампанент * |
| **Кароткі змест** | Палеаграфія як навука. Прадмет і задачы палеаграфіі, асноўны метад палеаграфіі. Крыніцы для палеаграфічных даследаванняў і дапаможнікі па палеаграфіі. Гісторыя і ўзнікненне першай славянскай азбукі. Друкарская дзейнасць Францыска Скарыны. Графічныя асаблівасці выданняў Скарыны. Паслядоўнікі Ф.Скарыны. Палеаграфічныя прыкметы старадрукаў. Матэрыялы пісьма. Папірус, пергамент, папера. Асноўныя матэрыялы пісьма ў славян. Тэхналогія вырабу пергаменту. Першыя папяровыя млыны на тэрыторыі Беларусі. Прылады пісьма. Асаблівасці прыгатавання і састаў чарніла ад старажытных пісараў да нашых дзён. Старажытныя і сучасныя прылады пісьма. Фармат і пераплёт рукапісаў. Сістэма разліноўкі ліста паперы, памер старонак, нумарацыя старонак, пераплёт кніг і рукапісаў. Кнігі. Граматы. Пячаткі. Пісары і іх роля ў стварэнні пісьмовых помнікаў. Старажытны арнамент. Вязь як дэкаратыўнае пісьмо; вадзяныя знакі і іх паходжанне. Віды кніжнага арнаменту ў рукапісных і друкаваных помніках старабеларускага пісьменства. Тыпы пісьма (почырку). Устаў. Паўустаў. Скарапіс. Узнікненне крыптаграфіі. Віды сістэм тайнапісу. Гісторыя кнігадрукавання. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | Базавыя прафесійныя кампетэнцыі: БПК-5: Вызначаць заканамернасці гістарычнага развіцця фанетычнага, марфалагічнага, сінтаксічнага ладу беларускай мовы. Студэнт павінен ведаць: заканамернасці, тыповыя з’явы і пераходныя выпадкі моўных з’яў; тэарэтычныя і гістарычныя аспекты мовазнаўства; шляхі і заканамернасці развіцця графічнай сістэмы беларускай мовы; метадалогію, гісторыю, асноўныя канцэпцыі апісання беларускай мовы; сістэму роднай мовы і яе ўзроўні, сувязь яе графічнай і арфаграфічнай падсістэм; умець: выкарыстоўваць веды аб графічнай структуры беларускай мовы; чытаць старажытныя рукапісы; вызначаць тып пісьма па методыцы вызначэння месца і часу напісання помнікаў пісьменнасці, па графічных асаблівасцях і знешняму выгляду і афармленню рукапісаў; расшыфроўваць крыптаграфічныя тэксты; прымяняць прафесійныя веды пры чытанні старажытных рукапісаў. |
| **Прэрэквізіты** | “Уводзіны ў мовазнаўства”. |
| **Працаёмкасць** | 3 заліковыя адзінкі, 108 акадэмічных гадзін, з іх 52 аўдыторныя: 28 г лекцый і 24 г практычных заняткаў. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 2-й семестр, залік. |